УДК 821.161.3:94”18

***П. Р. Кошман***

# МАСТАЦКІЯ ПОШУКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГЕРОЯ Ў ЛІТАРАТУРЫ БЕЛАРУСІ ХІХ СТАГОДДЗЯ

*Станаўленне ў айчыннай літаратурнай традыцыі ўстойлівага вобліку нацыянальнага героя з’явілася адной з першачарговых задач перыяду ХІХ стагоддзя, вырашэнне якой было звязана з пераадоленнем сацыяльных супярэчнасцей унутры беларускага этнасу і пошуку ўзаемапаразумення на аснове традыцыйных маральна-этычных каштоўнасцей.*

Станаўленне ў айчыннай літаратурнай традыцыі ўстойлівага вобліка нацыянальнага героя з’явілася адной з першачарговых задач перыяду ХІХ стагоддзя, вырашэнне якой было звязана з пераадоленнем сацыяльных супярэчнасцей унутры беларускага этнасу і пошуку ўзаемапаразумення на аснове традыцыйных маральна-этычных каштоўнасцей.

Ужыванне ў літаратуразнаўстве паняцця “нацыянальны герой” мае падвоены сэнс. З аднаго боку, яно ўказвае на персанаж, які ўспрымаецца як увасабленне лепшых уласцівасцей нацыянальнага характару, акрэслівае той дасканалы вобраз, які служыць узорам для ўсёй нацыі. З другога, вызначэнне нацыянальнай сутнасці літаратурнага героя скіравана на рэалістычны змест і прызначана падкрэсліць дакладнасць перадачы ў мастацкім вобразе тых істотных характарыстык, якія ўказваюць на прыналежнасць персанажа да пэўнай нацыянальнай супольнасці. Па сутнасці, перад намі два ідэйна-эстэтычныя падыходы да мадэліравання вобраза літаратурнага героя – ідэалізацыя і тыпізацыя, праз якія, акрамя вырашэння ўласна мастацкіх задач, у нацыянальным статусе персанажа знаходзяць адбітак найважнейшыя кампаненты працэсу самапазнання нацыі, яе імкненне праз літаратуру сцвердзіць свой ідэал і спасцігнуць свой рэальны воблік.

Прызнанне нацыянальнага героя ў мастацкай прасторы літаратуры сведчыць аб поўнай сфарміраванасці ёю ўласных светапоглядных традыцый. Літаратура Беларусі ХІХ ст. не мела таго высокага ўзроўню самастойнасці, які б даў падставы гаварыць аб завершанасці ў ёй

МГПУ им. И.П.Шамякина

канструкцыі нацыянальнага вобраза свету. Аднак яе творы сведчаць аб паступовым пратэжаванні мясцовымі аўтарамі менавіта свайго бачання свету, таго арыгінальнага погляду на рэчаіснасць, які магчыма было сфакусіраваць на зямным шары толькі з таго месца, дзе знаходзіцца наша краіна. Прыцяжэнне генетычна блізкіх польскай і расійскай традыцый адцясняла беларускасць на другі план толькі да пэўнага часу, і яшчэ ў пазамінулым стагоддзі праблема нацыянальнай сутнасці героя набыла актуальнасць у айчынным мастацтве слова. Яна развівалася разам з паступовым назапашваннем у літаратуры шэрагу пазнавальных характарыстык беларускага народа і канчаткова праявілася ў востра пастаўленым Ф. Багушэвічам пытанні аб нацыянальнай ідэнтычнасці тутэйшага чалавека.

Ад моманту з'яўлення ў літаратуры мастацкая трактоўка вобраза беларуса аказалася цесна звязанай з яго сацыяльным, ці дакладней, сялянскім паходжаннем, паколькі менавіта гэтая сацыяльная група складала аснову беларускага этнасу. У. Гніламёдаў мяркуе: "Вясковае жыццё, па сутнасці, – калыска беларускай літаратуры XIX стагоддзя" [1, 16], таму заканамерна, што вобраз селяніна стаў успрымацца як узорнае ўвасабленне беларуса. Аднак пануючы ў савецкі час прынцып класавасці мастацтва арыентаваў даследчыцкія памкненні на поўнае прыпадабненне гэтых вобразаў і тым самым збядняў нацыянальны змест характару героя. Персанажы беларускай літаратуры XIX ст. разглядаліся найперш у кантэксце класавай барацьбы, а таму пытанне аб прыналежнасці прадстаўнікоў розных сацыяльных слаёў грамадства да адзінай этнічнай супольнасці ігнаравалася. З гэтай нагоды варта заўважыць, што постаць селяніна стала дамінуючай у літаратурнай традыцыі Беларусі толькі на схіле XIX ст., а да гэтай пары побач з ёю беларускасць ці ліцвінскасць прадстаўлялі не менш каларытныя вобразы шляхціцаў. Найперш гэта датычыцца персанажаў накшталт Завальні ("Шляхціц Завальня" Я. Баршчэўскага) ці Лагоды ("Акраец хлеба" У. Сыракомлі), што прадстаўляюць тып героя, вельмі блізкага да сялянскага ўкладу жыцця, але здольнага ўзняцца над прыватнымі штодзённымі патрэбамі і задумацца аб агульнанародных праблемах. У сваю чаргу вобразы такіх высакародных паноў, як Тадэвуш Сапліца ці Караль Лятальскі, таксама дэманструюць важнасць прыналежнасці літаратурнага героя XIX ст. да роднай зямлі, што з'яўляецца своеасаблівым індыкатарам узроўню яго духоўнага развіцця.

Многія пісьменнікі XIX ст. бачылі вырашэнне грамадскіх праблем не ў абвастрэнні класавай барацьбы, а, надварот, у пошуку ўнутранай згоды. Яны прапаноўвалі праз літаратуру мадэль сацыяльных адносін, у аснове якой знаходзілася не супрацьпастаўленне саслоўных інтарэсаў, а адзінства культурных і гістарычных традыцый таго краю, які быў родным і для сялян, і для шляхты. "Уклаў Бог адны нам пачуцці у грудзі, // Мы ўсе — адной мацеры дзеці" [2, 65], – выражаная ў гэтых словах Я. Чачота думка

МГПУ им. И.П. Шамякина

аб еднасці “любых сялян” і “вяльможных паноў” стала для тагачаснай літаратуры ідэйным фундаментам канструявання нацыянальнай карціны свету. Так, В. Дунін-Марцінкевіч, узнаўляючы ў паэтычным слове беларускія народныя абрады, лічыў неабходным знайсці месца сярод іх удзельнікаў і прадстаўнікам вышэйшага саслоўя. У апісаннях святкавання дажынак у сяле Шчароўскім ці сватання Гапона цэнтральнымі паўстаюць тыя кранальныя сцэны, дзе пан або пані і прыгонныя сяляне, згодна са спрадвечным звычаем, дэманструюць агульную любоў і павагу. З нарастаннем вызваленчага руху ў сярэдзіне XIX ст. неабходнасць пераадолення саслоўнага антаганізму стала яшчэ больш відавочнай. Паўстанцкая газета “Мужыцкая праўда”, нягледзячы на ўласцівыя ёй радыкальныя погляды, узаемаадносіны шляхты і сялян асвятляла дастаткова паліткарэктна: падкрэслівала іх прыналежнасць да аднаго народа “вольнага і багатага”, які калісьці перад пагрозай суседзяў “немца” і “маскаля” быў вымушаны падзяліцца: “І гэтак было доўга: адны баранілі краю, усё хадзілі па войнах, а другія то аралі, то сеялі, то касілі, то жалі” [3, 290].

Агульным у прыведзеных паэтычных прызнаннях Я. Чачота, этнаграфічных замалёўках В. Дуніна-Марцінкевіча, гістарычных экскурсах К. Каліноўскага бачыцца ідылічнасць аўтарскага погляду. Створаныя пісьменнікамі вобразы не адпавядалі рэальнай карціне жыцця, дакладней, не з’яўляліся яе тыповымі адзнакамі. Але, думаецца, беларускія літаратары XIX ст. выдавалі жаданае за сапраўднае не таму, што самі знаходзіліся ў палоне нейкіх ілюзій. Для іх літаратурная творчасць была найперш працягам грамадскай дзейнасці, спосабам выражэння ўласнай неабыякавай пазіцыі. З дапамогай мастацтва слова – самага эфектыўнага ва ўмовах XIX ст. сродку фарміравання грамадскай думкі – яны звярталіся да суайчыннікаў з ідэяй пошуку ўзаемапаразумення, сцвярджэння прыярытэту агульначалавечых і агульнанародных інтарэсаў над саслоўнымі забабонамі.

Тым самым беларуская літаратура рэалізоўвала свой нацыятворчы патэнцыял, фарміравала ў чытацкай аўдыторыі тыя агульныя прадстаўленні, сумесныя перажыванні, з якіх, паводле тэорыі паходжання нацый Б. Андэрсана, і нараджалася нацыянальная ідэнтычнасць. Роля айчыннай літаратуры ў гэтым працэсе на працягу XIX ст. ускладнялася адсутнасцю масавага адукаванага чытача ў тых творах, што былі напісаны па-беларуску ці выяўлялі беларускую праблематыку. Паказальна прызнанне В. Дуніна-Марцінкевіча, які наракаў на цяжкасці з распаўсюджваннем уласных кніг і папярэджваў свайго сябра У. Сыракомлю ў адсутнасці чытацкага інтарэсу да айчыннай літаратуры: “Аднак не вер, што модныя салоны // З ахвотаю твае хапаюць творы, // Для іх мілейшыя чужыя плёны, // Рамансы франкаў – вось чытання ўзоры. // А ліра свойская ўзбуджае смехі – // Яна для чэрні пад гнілыя стрэхі! [4, 95].

МГПУ им. И.П.Шамякина

Гэтакі месідж аўтараў-пачынальнікаў, акрамя задач уласна гуманістычнага ды сацыяльнага характару, няўхільна скіроўваў погляд грамадства пры ўспрыманні праблемы ўзаемаадносін пана і селяніна ў сферу пытанняў, звязаных з вырашэннем лёсу Айчыны. Ідэалагема трагічнай раздвоенасці беларускага народа адыграла вызначальную ролю ў канструяванні нацыянальнай карціны свету, на працяглы час абумовіла канцэпцыю яе развіцця ў літаратуры. Цяжкая доля селяніна як найбольш тыповая адзнака рэчаіснасці Беларусі XIX ст. стала цэнтральнай тэмай нацыянальнай міфатворчасці, ад якой адштурхоўвалася літаратура, вымяраючы глыбіню мінулага беларускага народа і перспектывы яго будучыні. Прапаноўваючы альтэрнатыву змрочнаму сёння, літаратура звярнулася да ідэалізацыі гісторыі, стварыла вобраз-міф своеасаблівага “залатога веку” беларускага народа, калі ён не ведаў падзелу на саслоўі і жыў без паншчыны. Цікава, што, калі напярэдадні і падчас паўстання 1863 года палітычныя эмоцыі асабліва захлынулі літаратуру, супрацьлеглыя бакі аднолькава тлумачылі гістарычныя вытокі паншчыны неабходнасцю абараняцца ад знешніх ворагаў.

Відавочна, што для XIX ст. той аўтарскі погляд, які аб’ядноўваў бы інтарэсы ўсяго народа, усіх яго сацыяльных груп, быў даволі рэдкаю з’яваю. Але сітуацыя, калі аўтары звярталіся да асэнсавання тэмы вусна-паэтычнай ці гістарычнай спадчыны і рабілі пры гэтым акцэнт на адзінстве сялянства і шляхты, бачыцца ўжо тыповай для тагачаснай літаратуры. Так, Я. Чачот, падкрэсліваючы ў прадмове да зборніка “Сялянскіх песень з-над Нёмана і Дзвіны” значэнне сабранага ў іх матэрыялу, пісаў: “Паэзія, якую мы называем сёння гміннай, простанароднай, была некалі агульнай для ўсіх нашых продкаў: для паноў, князёў, словам, агульнанароднай; ужо ад аднаго гэтага яна павінна была б карыстацца большай павагай нават у тых, хто нічога добрага не хоча бачыць ва ўсім, што ёсць простанароднае, сялянскае” [2, 215]. Раскрываючы аўтэнтычны змест беларускага фальклору, літаратары адзначалі ролю сялянства ў захаванні спрадвечных традыцый. На гэтыя духоўныя скарбы спадзяваўся Я. Баршчэўскі ў справе вяртання да родных вытокаў тых суайчыннікаў, якія ў пагоні за чужаземным бляскам забыліся пра сваю зямлю. Праз літаратуру ў грамадстве пашыралася думка аб немагчымасці сапраўднага служэння Радзіме, калі заставацца абыякавым да духоўнага і матэрыяльнага ўкладу жыцця вясковага люду. І. Храпавіцкі ў артыкуле “Погляд на паэзію беларускага люду”, закранаючы праблему гаротнага становішча сялянства, звяртаўся да грамадскасці: “Мы дарэмна чакаем, што рэчы стануць іншымі, калі не будзем намагацца лепей пазнаць маральны і фізічны стан нашых сялян, і, пазбавіўшыся такое шкоднае абыякавасці, аказваць на іх уплыў нашае асветы. Нашы пісьменнікі маглі б эфектыўна спрыяць гэтай выратавальнай справе, абуджаючы цікавасць вышэйшага класа да таго народа, які з-за паэтычнага характару, а таксама душэўных вартасцяў і нешчаслівага становішча пэўна заслугоўвае гэтага” [6, 1033].



МГПУ им. И.П.Шамякина

Беларускае сялянства паступова станавілася той грамадскай сілай, з якой неабходна было лічыцца. Значэнне гэтага самага вялікага па колькасці сацыяльнага класа прасочваецца на прыкладзе эвалюцыі ацэнак яго месца ў гісторыі. У літаратуры амаль усёй першай паловы XIX ст. тэма мінулага краіны манапольна належала вышэйшаму саслоўю, што выдатна відаць па гістарычных творах А. Міцкевіча ці “Спевах пра даўніх ліцвінаў” Я. Чачота, прысвечаных асэнсаванню ўчынкаў князёў, магнатаў, шляхціцаў. Першыя даследчыкі беларускага фальклору, справядліва адзначаючы слабасць адлюстравання ў ім гістарычнай тэмы, бачылі прычыну гэтага ў тым, што простаму народу ў мінулым была адведзена роля пасіўнага сузіральніка тых падзей, якія адбываліся на яго зямлі. “Люд у беларускіх правінцыях, – адзначаў І. Храпавіцкі, – з таго часу, як гісторыя наша пачынае высвятлівацца, аніякага не браў удзелу ў кіраўніцтве краем, ні ў беспарадках, якія бесперапынна мянялі палітычную арганізацыю. Ён падпадаў пад уплыў Літвы, Польшчы і Расіі, абыякава пазіраючы на войны, якія вялі між сабою гэтыя дзяржавы” [6, 1033].

Прысутнасць селяніна ў гісторыі краю бадай што першым адзначыў У. Сыракомля, паэтычнае служэнне якога сягала далёка за межы аднаго саслоўя і адрознівалася разуменнем важнасці ўсіх сіл народа ў лёсе Айчыны: “То з плугам, то з крыжам, то з мечам, то з чаркай // Тут хвілі літвіна міналіся шпарка” [5, 114]. Помнікі слаўнага мінулага бачыліся патрыятычна настроенаму пісьменніку не толькі ў замкавых мурах і палацах, але і ў звыклых вясковых малюнках роднага краю:

Капец сярод поплаву, крыж падарожны,
Старая карчма, слуп каменны, капліца –
Гісторыі нашай у іх таямніца,
Паданні пра дзеі, пра славу айчыны.
Хіба ж іх забыць мы павінны, літвіны? [5, 114].

Паэтычная прэзентацыя сялянскага мінулага была не толькі своеасаблівым актам вяртання гістарычнай справядлівасці ці спробай эстэтычна разнастаіць вобраз Радзімы. Аддаючы належнае ўкладу братоў з вясковых ніў у гісторыю краіны, пісьменнікі звязвалі гэтыя вобразы ў адзінае цэлае, фарміравалі ўяўленне аб іх непадзельнасці. Селяніну, патрыятызм якога ў фальклорнай традыцыі абмяжоўваўся лакальнымі вобразамі накшталт роднай хаты ці роднай вёскі, мастацтва слова прапаноўвала выходзіць на шырокія абсягі нацыянальнага пачуцця, прывівала яму адчуванне прыналежнасці да вялікага краю, у якога ёсць і трагічнае, і слаўнае мінулае. Уздымаючы годнасць мужыка-беларуса, паэтычнае слова адрывала яго самога ад звыклых уяўленняў аб сваёй нікчэмнасці, пасіўнасці, і на схіле XIX ст. вуснамі Мацея Бурачка запрашала адчуць сваё месца ў гісторыі той дзяржавы, якая “пяцьсот дваццаць гадоў таму назад ужо была ад Балтыцкага мора ўздоўжкі аж да Чорнага…” [7, 22] і ў сярэдзіне якой, “як тое зярно ў гарэху, была наша зямліца – Беларусь!” [7, 22].

МГПУ им. И.П. Шамякина

Адзначым такую дэталь, што літаратурныя пошукі агульнай асновы нацыянальнага свету вяліся пісьменнікамі, якія паходзілі пераважна з дробнай шляхты ці чыноўнікаў, – таго асяроддзя, якое пастаянна судакраналася з жыццём простага люду і мела магчымасці аб’ектыўна ацаніць як вартасці, так і недахопы яго светапогляду. У выніку адбыўся своеасаблівы абмен духоўнымі каштоўнасцямі: пісьменнікі-шляхціцы пераймалі сялянскі фальклор, а ўзамен прапаноўвалі гістарычную спадчыну. На глебе гэтага шляхецка-гістарычнага і сялянска-фальклорнага ўзаемадзеяння ў літаратуры Беларусі на працягу XIX ст. паступова ўкаранялася традыцыя нацыянальнага светапогляду, фарміравалася ўяўленне аб культурнай самабытнасці беларусаў.

Літаратура

1. Гніламёдаў, У. Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 246 с.

2. Чачот, Я. Выбраныя творы / Я. Чачот; уклад., пер. з польскага, прадм. і камент. К. Цвіркі. – Мінск: МФ "Беларускі кнігазбор", 1996. – 374 с.

3. Заняпад і адраджэнне: беларуская літаратура XIX ст. / уклад., прадм. і заўв. У. Казберука. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 606 с.

4. Дунін-Марцінкевіч, В. Збор твораў: у 2 т. / В. Дунін-Марцінкевіч; уклад. з тэкст. падрыхт., пер. Я. Янушкевіча. – Мінск: Маст. літ., 2008. – Т. 2. Вершаваныя аповесці і апавяданні, вершы, публіцыстыка, лісты і пасланні. – 598 с.

5. Сыракомля, У. Выбраныя творы / У. Сыракомля; уклад., прадм., камент. К. Цвіркі. – Мінск : Бел. навука, 2011.

6. Храптовіч, І. Погляд на паэзію беларускага люду / І. Храптовіч // Літаратура першай паловы XIX стагоддзя / укладанне і каментарыі М. В. Хаўстовіча; навук. рэд. С. Л. Гаранін. – Мінск: Маст. літ., 2012. – С. 1011–1034.

7. Багушэвіч, Ф. Творы / Ф.Багушэвіч; уклад. і прадм. Я. Янушкевіча; камент. У. Содаля, Я. Янушкевіча. – 2-е выд. – Мінск: Маст. літ., 2001. – 206 с.

МГПУ им. И.П.Шамякина